ECKERÖ LINE

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ НА БОРТ MS FINLANDIA!

**Мы жадаем вам весела збавіць час на борце MS Finlandia, таму мы сабралі тут некаторую інфармацыю, якая можа аказацца карыснай!**



# РЭГІСТРАЦЫЯ

У Хельсінкі стойка рэгістрацыі знаходзіцца ў тэрмінале **Länsiterminaali T2** (альбо Заходні порт T2), а ў Таліне — у **Тэрмінале-А**. Рэгістрацыя пачынаецца за 2 гадзіны да адпраўлення і заканчваецца за 45 хвілін да запланаванага часу адпраўлення. Калі ласка, прыязджайце на рэгістрацыю не пазней, чым за 1 гадзіну да адпраўлення!
Eckerö Line прапануе розныя варыянты рэгістрацыі. Калі ласка, націсніце тут для атрымання дадатковой інфармацыі. Калі ласка, прад'явіце свой пашпарт/пасведчанне асобы і нумар браніравання або ваўчар нашаму супрацоўніку стойкі рэгістрацыі, і атрымайце пасадачны талон. Вам спатрэбіцца пасадачны талон або QR-код, каб прайсці праз выхады на пасадку і патрапіць у асноўную зону чакання. Выхады на пасадку будуць адкрыты за 1,5 гадзіну да адпраўлення.

# ЦЯПЕР НА КАРАБЕЛЬ!

Калі будзе абвешчана пасадка на карабель, калі ласка, прайдзіце з зоны чакання на карабель. Пры ўваходзе на MS Finlandia вы апыніцеся на **6-й палубе**. Сардэчна запрашаем на борт карабля!

ECKERÖ LINE




- Cafe Satama
- Kids' Corner
- Buffet Eckerö
- Bar Naissaar
- Pop Up Shop
- Pub Telakka
- Pub Jätkäsaari
- Bar Nosturi
- Bar Paja
- Info
- Eckerö Market & Parfymeria
- Bar Laituri
- Toilets
- Conference Centre & Lounge

ECKERÖ LINE




## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ СТОЙКА

Каля інфармацыйная стойцы на **6-й палубе** вы знойдзеце звесткі аб нашым караблі і нашых канчатковых пунктах маршруту (напрыклад карты гарадоў Таліна і Хельсінкі). Тут таксама можна купіць каюту ці абмяняць манеты для камеры захоўвання. Тут знаходзіцца і станцыя для зарадкі мабільных тэлефонаў. Каля інфармацыйнай стойцы вы можаце купіць газеты, часопісы, безалкагольныя напоі і тытунёвыя вырабы.

## ПРЫБІРАЛЬНІ НА БОРЦЕ КАРАБЛЯ

Вы можаце знайсці прыбіральні і месцы для мыцця рук на **палубах 7, 8, 9**. Глядзіце план карабля, які можна знайсці на кожным паверсе побач з лесвіцай.

# КАЮТЫ



MS Finlandia прапануе падарожнічаць у камфартабельнай прыватнай каюце.
Вы можаце загадзя забраніраваць каюту альбо набыць яе каля інфармацыйная стойцы.
На борце MS Finlandia маецца мноства розных тыпаў кают - ёсць унутраныя каюты і каюты з выглядам на мора, каюты на дваіх ці на чацвярых, спецыяльныя каюты для алергікаў і пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, каюты для пасажыраў з хатнімі жывёламі.
Ва ўсіх каютах ёсць душ і прыбіральня. У каюце вы можаце адпачыць пасля доўгага дня або ранняга абуджэння, ці можаце пакінуць там свой багаж і рэчы і пайсці павячэраць у рэстаранах, якія знаходзяцца на карабеле, або зрабіць пакупкі на Eckerö Market.

ECKERÖ LINE



## МЕСЦА НА БОРЦЕ КАРАБЛЯ

Вы можаце выбраць любое свабоднае месца, каб прысесці і расслабіцца. Майце на ўвазе, што ў летні час наверсе, на нашай цудоўнай сонечнай палубе, таксама ёсць каля **450 месцаў**! Вы таксама можаце купіць каюту для камфортнага і больш прыватнага падарожжа!

## БАГАЖ

Калі ў вас ёсць багаж, які вам не спатрэбіцца падчас падарожжа, вы можаце бясплатна пакінуць яго ў нашых **камерах захоўвання** на **палубах 6 і 7**. Камеры захоўвання замыкаюцца падчас марскога рэйса, і вы не можаце атрымаць да іх доступ. Вы таксама можаце выкарыстоўваць **камеры захоўвання** на **палубах 6 і 7**, плата за захоўванне якіх аплачваецца плацежнай картай. QR-код на вашым пасадачным талоне служыць ключом ад шафкі. Вы таксама можаце забраніраваць каюту, дзе вы зможаце адпачыць падчас падарожжа і пакінуць свой багаж і іншыя рэчы.




## БІЗНЕС-ЗАЛА

Побач з інфармацыйнай стойкай знаходзіцца бізнес-зала. За дадатковую плату вы можаце скарыстацца паслугамі бізнес-залы: асабістае месца ў ціхай зале з хуткім WIFI, свежая садавіна, прысмакі і дэсерты, а таксама напоі: гарбату, свежазвараную каву, сокі, безалкагольныя напоі, разліўное піва і віно. Пасля аплаты за ўваход вы можаце свабодна ўваходзіць і выходзіць з залы падчас марскога падарожжа.



# ЧАС ПАКАЗУ ШОУ!

Вы можаце атрымаць асалоду ад жывой фінскай музыкай у **бары Nosturi** ці ў **пабе Telakka** на **палубе 8**, а ўлетку таксама ў **бары Laituri** на **палубе 9**. Праграма круізу даступная каля нашай інфармацыйнай стойцы.

# НАПОІ



Вы можаце купіць напой у любым з нашых бараў на **палубе 8**, а ў летні час таксама на **палубе 9**. Калі вы жадаеце келіх шампанскага, то адпраўляйцеся ў **бар Naissaar**, калі вы хочаце выпрабаваць атмасферу паба і паспрабаваць навінкі невялікіх фінскіх і эстонскіх піваварняў, то адпраўляйцеся ў **паб Telakka** - абодва размешчаны на **палубе 8**!

# КАВА, ГАРБАТА І ЗАКУСКІ

Лепшы выбар свежай кавы і гарбаты можна знайсці ў **Bistro & Cafe Satama** на **палубе 8**. У кафэ таксама вам прапануюць сэндвічы, салаты, закускі, бургеры і іншыя гарачыя стравы. Тут таксама можна купіць самую папулярную лёгкую закуску на караблі – сэндвіч з крэветкамі!




# ГЭТА ТАК СМАЧНА!

**Buffet Eckerö**, галоўны рэстаран карабля, прапануе лепшыя сезонныя фінскія і скандынаўскія інгрэдыенты і далікатэсы, якія маюць цудоўны густ хатняга прыгатавання. Buffet Eckerö на **палубе 8** прапануе сняданак, абед і вячэру. Buffet Eckerö – лепшае месца, каб зрабіць сапраўднае свята на моры і пачаць знаёмства з фінскай кухняй! Наш буфет з халоднымі і гарачымі закускамі раскошны і прапануе паспрабаваць заўсёды свежыя і смачныя цудоўны смакі Балтыйскага мора, фінскіх лясоў і садоў! У кошт таксама ўваходзяць безалкагольныя напоі, кава, чай, сокі, разліўное піва і віно. Прыходзьце і даведайся аб наяўнасці месцаў і цэнах!




# ПАКУПКІ

Несумненна, гэта лепшая забава! **Eckerö Market** на **палубе 6** прапануе самыя папулярныя брэнды парфумерыі, касметыкі і сродкаў для надання свежасці і прыгажосці твару і целу. Таксама там можна знайсці такія фінскія брэнды, як Lumene! У дадатак да парфумернай прадукцыі, Eckerö Market мае шырокі выбар прысмакаў і шакаладу і шырокі выбар розных напояў.

**PopUp Shop** на **палубе 8** заўсёды прапануе захапляльныя навіны моды ад якасных брэндаў. У PopUp Shop вы знойдзеце шырокі асартымент аксесуараў, такіх як ювелірныя вырабы і гадзіны, а таксама прадметы адзення, якія ідэальна падыходзяць для падарункаў і сувеніраў!



# АДКРЫТЫЯ ПЛЯЦОЎКІ

**Верхняя палуба карабля** (**палуба 9**) - гэта цудоўнае месца, дзе можна прагуляцца і паглядзець на цудоўныя марскія пейзажы. Калі вы хочаце сфатаграфаваць прыбыццё ў Хельсінкі ці Талін, лепшы час для гэтага прыкладна за 30 хвілін да прыбыцця ў порт. **Бар Laituri** на **палубе 9** адчынены толькі ў летні час. Прыходзьце і ўдыхніце сапраўднага паветра Балтыйскага мора!

# ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА

У нашай кавярні на **палубе 8** ёсць гульнявая пляцоўка для дзяцей. У летні час некаторыя з нашых канферэнц-залаў на **палубе 6** будуць ператвораны ў дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі!

# КУРЭННЕ

Калі ласка, майце на ўвазе, што наш карабель (уключаючы каюты і прыбіральні) з'яўляецца зонай для некурцоў. Курэнне дазволена толькі на адкрытым паветры ў спецыяльна адведзеных для курэння месцах.

# ВЫПРАБУЙ УДАЧУ!

На борце карабля няма казіно, але ёсць некалькі гульнявых аўтаматаў на **палубе 8**, побач з пабам Telakka і барам Nosturi.

# ПАДАРОЖЖА З ТРАНСПАРТНЫМ СРОДКАМ

Калі вы падарожнічаеце на аўтамабілі, то будзьце ў порце не менш за **1,5 гадзіны** да адпраўлення. Прытрымлівайцеся дарожных знакаў, а а пасля рэгістрацыі кіруйцеся ўказанням нашых рэгуліроўшчыкаў руху як на сушы, так і на караблі. Калі ласка, памятайце, што вы не можаце заставацца ў машыне ці наведваць транспартны сродак падчас падарожжа. Рэгістрацыя аўтамабіля заканчваецца за 45 хвілін да адпраўлення.



ECKERÖ LINE

# ВЫСАДКА НА БЕРАГ




Сысці з карабля ў канчатковым пункце маршруту вельмі проста. Адбываецца гэта з таго ж месца на **6-й палубе**, адкуль вы ўвайшлі на карабель. За 10 хвілін да прыбыцця ў канчатковы пункт маршруту ў гучнагаварыцелях карабля прагучыць адпаведная аб’ява. Яшчэ адна аб’ява будзе зроблена, калі можна будзе пакінуць карабель. Вось цяпер вы можаце пакінуць карабель.

# ДЗЯКУЙ! KIITOS! AITÄH!

Мы дзякуем вам за падарожжа з намі і спадзяваемся, што вам спадабалася на борце MS Finlandia. Будзем рады ўбачыць вам зноў!

Больш падрабязную інфармацыю аб MS Finlandia і Eckerö Line вы можаце знайсці на нашым вэб-сайце
www.eckeroline.com/welcome-belarus